by John O'Donovan, L.L.D., M.R.I.A., barrister at law. Second edition. 7 vol. Dublin, 1856.
6. AnnalaUladh. AnnalaSenait. Annals of Ulster. Annals of Senat; a Chronicle of Irish Affairs from A.D. 431, to A.D. 1540 edited, with a translation and notes by William M. Hennessy, M.R.I.A. (vol. 1), B. Mac Carthy, D.D., M.R.I.A (vol. 2,3) : in 3 vol. Dublin, 1887–1895.
7. A Statute of the fortieth Year of Edward III., enacted in a Parliament held in Kilkenny, A.D. 1367… // Tracts Relating to Ireland Printed for the Irish Archaeological Society. Vol. II. Dublin, 1841. P. 141–298.
8. I. State of Ireland, and Plan for It's Reformation // State Papers published under the Authority of His Majesty's Commission. Vol. 2. Correspondence between the Governments of England and Ireland. 1515–1538. Part III. – 1834.

# ПАЗІЦЫЯ ПРАВАСЛАЎНАЙ ЦАРКВЫ РЭЧЫ ПАСПАЛІТАЙ АДНОСНА ПАЛЯВАННЯ НА ВЯДЗЬМАРАК

**В. А. Быль**

Вялікае княства Літоўскае з'яўлялася арганічнай часткай еўрапейскай раннемадэрнай прасторы, таму наша дзяржава была ўключана ва ўсе значныя агульнаеўрапейскія працэсы, у тым ліку і такія адыёзныя, як паляванне на вядзьмарак. Тым не менш, гэтыя працэсы мелі на землях ВКЛ значныя асаблівасці, што вызначалася як геапалітычным становішчам краіны, так і ўласнай спецыфікай грамадства. Гэта ж можна адзначыць і адносна таго, як працякала паляванне на вядзьмарак у ВКЛ. Адным з важных чыннікаў, што паўплывалі на ведаўскія ўяўленні ва Ўсходняй Еўропе, была праваслаўная царква. Праваслаўная традыцыя з'яўляецца больш старажытнай і першапачаткова – дамінуючай у Вялікім княстве, таму важна зразумець яе ўплыў на свядомасць носьбітаў як вучонай, так і народнай культуры, тым больш, што гэта традыцыя ў значнай меры працягвалася і ўніяцтвам.

З прыняццем хрысціянства ў якасці пануючай рэлігіі Усходняй Рымскай імперыі змаганне з чараўнікамі стала часткай барацьбы з язычніцтвам. У гэткіх умовах у Візантыі адбывалася фарміраванне праваслаўнага кананічнага права, якое ў VI стогоддзі было зведзена ў адзін зборнік – "Номаканон" канстанцінопальскім патрыярхам Іаанам Схаластыкам [1, с. 292, 293]. Гэта сістэма царкоўнага права пасля была запазычана краінамі, дзе панавала "грэчаская вера", у тым ліку Руссю і, пазней, ВКЛ.

Чарадзейства як злачынства аказалася пад увагай пачынаючы з хрышчэння Русі. Юрыдычныя асновы вызначаліся найперш візантыйскім вопытам. У другой палове XI стагоддзя "Номаканон" быў перакладзены для балгарскай царквы і затым распаўсюджаны на Русі. З канца XIII стагоддзі "Номаканоны" ў рускай перапрацоўцы атрымалі

назву “Кормчыя кнігі”. Яны дапаўняліся рашэннямі мясцовых сабораў, нормамі свецкага права [1, с. 293–294].

Царкоўны статут Уладзіміра, які склаўся на працягу к. X – пач. XII стагоддзяў, гаворачы пра падзел кампетэнцыі духоўнай і свецкай судовай улады, ад імя князя Уладзіміра заяўляе: “И аз, съгадав с своими детми, и с всеми князи, и с своими бояры, дал есми те суды церквам Божьим, митрополиту и всем епископом по Руской земли… ведовьство, потвори, чяродеание, волхъвование, зеленничьство, урекание три: бляднею, и зелий, и еретичьством… Тыи вси суды церквам Божьим даны суть законом Божьим, по правилом святых отец христианьскыми цари и князи в всех христианьских людех.” [2, с. 320–321] Як мы бачым, барацьбой з чарадзействам ва ўсіх выглядах занялася царква. Гэты царкоўны статут, па сутнасці, дзейнічаў да сярэдзіны XVI стагоддзя.

У XI – XII стст. з’яўляецца новы дакумент – царкоўны ўстаў Яраслава, які пацвярджае і дапаўняе папярэдні Устаў Уладзіміра. У Яраслававам уставе ёсць артыкул, па якой жанчыну, якая займалася якім-небудзь родам валхвавання, належыла караць, а мітрапаліту заплаціць пені 6 грыўняў. Адно з правіл рускага мітрапаліта Іаана II (1080–1089) тлумачыць, у чым павінна было заключаццп гэта пакаранне: тых, хто займаўся валхваваннем, належыла перш адхіляць ад граху славесным угаворваннем, а калі не паслухаюцца, “яро казнити”, але не да смерці, “ни обрезати сих телесе”. Пад “ярым”, строгім пакараннем, якое не пазбаўляе жыцця і не нявечыць, можна разумець толькі простае цялеснае пакаранне [3].

Паколькі епіскапскім судом без удзелу княскага разбіраліся толькі грахоўныя справы, у якіх не было элементу злачынства крымінальнага [3], то мы бачым, што чарадзея судзілі не за зробленую шкоду – maleficium, а за адхіленне ад праведнага шляху хрысціяніна, да яго ставіліся як да грэшніка, якога можна і трэба вярнуць у царкву.

У “Аповесці мінулых часоў” можна прасачыць эвалюцыю паганскага валхва ў “хрысціянскага” чараўніка. Як бачна з летапісу, старыя багі і духі ўпісаліся ў хрысціянізаваны светапогляд у якасці бесаў: яны жывуць у прорве ці пад зямлёй, баяцца хрысціянскага Бога і сяшчэнных атрыбутаў. Так, у адной з гісторый чараўнік не можа выклікаць духаў, бо на яго кліенце – крыж [4, с. 22].

У сваіх казаннях яшчэ Кірыла Тураўскі, як і іншыя тагачасныя свяціцелі, асуджае розныя віды гадання як грэх. А ў адной з прамоў, у “Слове о книжном почитании и учении” ён выступае супраць гадальных “отреченных книг”: “… Отреченные же книгы се суть: Астрономия, Звездочетья, Сонник, Волховник, Зелейник, Птичи чарове, Колядник, Громник, Метание – в нем лжюще пророчествуют и на святыя лжу

възлагают, - и прочая книгы, ими же беси привабливаючи, беседуют с ними…”[5, с. 447] Названыя кнігі даводзілі розныя спосабы прадказання будучыні па зорам, прыродным з’явам, паводзінам жывёл і інш. Можна заўважыць, што ўжо ў XII стагоддзі побач з традыцыйнай магіяй з’яўляюцца іншаземныя ўплывы, характэрныя для ўсёй Еўропы.

У адрозненне ад магутнай і прыкметнай традыцыі заходняй дэманалогіі, праваслаўная дэманалогія была маргінальнай з'явай. Ні Д'ябал, ні яго адданыя слугі так і не сталі годным прадметам выявы ў рэлігійным мастацтве і літаратуры. Дэманічныя істоты не атрымалі выразнага партрэта ў іканаграфіі. Звычайна яны выступалі як дадатак да выявы святога, у параўнанні з якім павінны былі выглядаць жалюварта [6, с. 115].

У праваслаўнай рэлігійнай літаратуры XVII стагоддзя Д'ябал і яго слугі згадваюцца часта, але твораў, цалкам ім прысвечаных, вельмі мала. Пэўную ўвагу гэтаму пытанню прысвяцілі Пётр Магіла, Іаанікій Галятоўскі, Антоній Радзівілоўскі, Дзмітры Растоўскі і некаторыя іншыя. Некаторыя з аўтараў лічылі, што злачынствы Сатаны асабліва прыкметныя ў XVII стагоддзі з-за войнаў, эпідэмій і агульнага падзення нораваў у грамадстве. Прапаведнікі выкарыстоўвалі гісторыі пра Д'ябла, дэманаў і ведзьмаў як рытарычнае сродак, асабліва калі гаворка ішла аб рэлігійных апанентаў, якім закідалі адносіны з дэманічнай сілай і празмерную веру ў вядзьмарства.

Кідаецца ў вочы абсалютная абыякавасць праваслаўных аўтараў да судоў па справах аб магіі. У адрозненне ад нямецкіх ці французскіх, у праваслаўных дэманалагічныя творах амаль няма прыкладаў з судовай практыкі, як за выключэннем гісторыі пра ведзьму-кухарку ў Пятра Магілы [6, с. 116].

Галоўным аб'ектам атакі прапаведнікаў былі грахі і грэшнікі. Д'ябла часта асацыявалі з грахом, таму, асуджаючы яго, прапаведнікі разам асуджалі грэх. Усіх грэшнікаў аб'яўлялі слугамі Сатаны, у прыватнасці ведзьмаў і ведзьмакоў, хоць апошніх асабліва не вылучалі. Не было неабходнасці распрацоўваць канцэпцыю пагаднення з Д'яблам ці таемных начных сходаў на шабашы, бо лічылася, што ведзьмы разам з іншымі грэшнікамі ўшаноўваюць свайго гаспадара Сатану злымі справамі.

Нягледзячы на адсутнасць такой канцэпцыі ў праваслаўнай традыцыі, крыніцы сведчаць, што частка адукаванай публікі ведала яе заходні варыянт. У асобных тэкстах знаходзім згадкі пра тое, што паміж Д'яблам і чараўніком існавалі спецыфічныя адносіны: што ведзьмы рэгулярна кантактуюць з дэманамі і тыя надзяляюць іх асаблівымі здольнасцямі выклікаць ілюзіі і прадказваць будучыню. Ёсць сведчанні, што ведзьмакі гулялі ролю пасрэднікаў паміж людзьмі і Д'яблам [6, с. 117]. Гэта новая тэндэнцыя з’яўляецца рэакцыяй праваслаўнай царквы на пашырэнне ў

Рэчы Паспалітай антыведаўскіх уяўленняў і разгортвання палявання на вядзьмарак. Такім чынам, заходнія ведаўскія канцэпцыі ў той ці іншай ступені, свядома ці міжволі запазычваюцца і праваслаўнай царквой, прынамсі ў нашай дзяржаве. Гэта не дзіўна, бо праваслаўная царква Рэчы Паспалітай пры ўсёй сваёй кансерватыўнасці не была ізалявана ад еўрапейскай вучонай культуры. Так, у Кіева-Магілянскай акадэміі вывучалі польскую мову і лаціну, што адкрывала яе выпускнікам доступ да здабыткаў лацінскай культуры. Праваслаўныя дзеячы ў свах творах цытуюць тэксты заходніх аўтараў. Так, у творчасці Антонія Радзівілоўскага можна знайсці цытаты і запазычанні з папулярных ва ўсёй Еўропе тэкстаў Іаана Вердэнскага, Іагана Герольта, Іахіма Камерарыуса, Ладавіка Гвіччыардзіні і інш [7, с. 66–70]. Таму відавочна, што праваслаўная царква адчувала значны ўплыў заходняй традыцыі, што яшчэ паглыбілася з прыняццем уніі.

У праваслаўнай традыцыі так і не была выпрацавана ідэя аб небяспецы, якую ведзьмы ўяўляюць для грамадства. Ведзьмам абяцалі суровае пакаранне ў замагільным свеце, але нідзе не згадвалі пра неабходнасць пераследваць іх у гэтым свеце. Параўнальна паблажлівае стаўленне да ведаўства з боку праваслаўнай царквы магло ўплываць на агульны характар судоў аб магіі: у процівагу сваім нямецкім, французскім, швейцарскім і англійскай калегам, праваслаўныя багасловы не цікавіліся чараўніцтвам у прававым кантэксце, не схільныя былі ўмешвацца ў судовыя справы аб чараўніцтве, а галоўнае - не заахвочвалі і не падбухторвалі вернікаў да якіх-небудзь актыўных дзеянняў супраць тых, каго вінавацілі ў вядзьмарстве.

**Літаратура**


1. Кормчая книга// Энциклопедический словарь. Т. 31. СПб., Брокгауз и Ефрон, 1895. С. 292–294.
2. Церковный Устав св. князя Владимира //Макарий (Булгаков), митрополит Московский и Коломенский. История Русской Церкви. Кн. 2. М., 1995. С.320–321.
3. *Ключевский В.* Русская история. Полный курс лекций. Лекция 15. Интернет-адрес: http://magister.msk.ru/library/history/kluchev/kllec15.htm.
4. Повесть временных лет. СПб., 1996.
5. Слово святаго Кирила о книжном почитании и о учении. // Мельнікаў А.А. Кірыл, епіскап Тураўскі: Жыццё. Спадчына. Светапогляд. Мн., 1997. С.447–448.
6. *Диса К.* Історія з відьмами. Суди про чари в українських воєводствах Речі Посполітої XVII-XVIII століття. Київ, 2008.
7. *Крекотень В.* Оповідання Антонія Радивиловського. З історії україньскої новелистики XVII ст. Київ, 1983.